засвоеных лексем-экзатызмаў, якія з'яўляюцца назвамі прадметаў побыту, жывёл, раслін, з'яў, культуры цюркамоўных народаў: *аймак, айран, бей, джэйран, іслам, калым, кашма, сайгак, шах, юрта, янычар, ятаган* і этымалагічных даследаванняў для даўно запазычаных і засвоеных слоў: *атаман, багатыр, ватага, казак, кішэня, кіндзюк, паёк, табун, таварыш, тайга, тытунь, уюк, хабар, чамадан, шалаш.*

УДК 946.7

У. А. Ломаць, аспірант

## САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА БЕЛАРУСІ Ў 1985 – 1994гг.

Сацыяльная сфера – гэта прастора паўсядзённага жыцця, развіцця чалавека як асобы. Яе асноўнымі параметрамі з'яўляюцца наступныя паказчыкі развіцця чалавека:

1) у канкрэтных паўсядзённых умовах жыцця – яго праца, быт, вольны час;
2) у гарантыях бяспекі – сацыяльнае забеспячэнне, працаўладкаванне, выконванне правоў чалавека і інш.;
3) у магчымасці карыстання культурнымі каштоўнасцямі і паслугамі – адукацыяй, інфармацыяй, літаратурай, мастацтвам і інш.;
4) у адкрытасці ў грамадстве ўсіх формаў перамяшчэння і самавызначэння як у працы, так і ў месцапражыванні.;
5) удзел у кіраванні вытворчым і сацыяльна-эканамічным развіццём у грамадскім жыцці і інш.

У перыяд з 1985 па 1994г. ва ўсіх вышэйназваных паказчыках сацыяльнага жыцця адбыліся значныя змены. Пачатак усім зменам быў пакладзены XXVII з'ездам КПСС, які раскрытыкаваў рэшткавы прынцып фінансавання сацыяльнай сферы і вызначыў яе як прыярытэтную ў жыцці грамадства. (Материалы XXVII съезда КПСС. Мн., 1985. С. 44 – 45.)

Ужо ў сярэдзіне 80-х гадоў стала абсалютна зразумелай неабходнасць перамен у сацыяльнай сферы грамадства. Каманднаадміністрацыйная бюракратычная сістэма з яе фармальным падыходам да вырашэння сацыяльна-культурных патрэб грамадства ўжо болей не задавальняла насельніцтва. Гэта было аб'ектыўнай рэальнасцю. Але задача па правядзенню ўсіх рэформ была зноў ускладзена на адміністрацыйную сістэму. У выніку гэта вызначыла палавінчатасць, а часам і алагічнасць пераўтварэнняў. (Прыкладам можа служыць барацьба з алкагалізмам). У 1986 годзе быў абвешчаны тэзіс аб моцнай

сацыяльнай палітыцы, хаця лепей было б праводзіць разумную палітыку.

У першую чаргу яе трэба было б скіраваць на паляпшэнне матэрыяльнага становішча грамадзян праз развіццё сфер вытворчасці тавараў групы Б. Але аналіз “Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на перыяд з 1986 па 1990 г.” сведчыць аб тым, што гэта адбывалася не зусім так. Праводзілася рэформа тарыфнай сеткі і павялічваліся памеры ставак і акладаў. Значна павялічыліся аб’ёмы будаўніцтва жылля, сацыяльна-культурных і аздараўленчых устаноў. Аднак гэта не спрыяла стымуляванню развіцця самой вытворчасці як асновы дабрабыту людзей, бо не была скасавана “ураўнілаўка” пры аплаце працы. А лозунг “ад кожнага па здольнасцях – кожнаму па працы” заставаўся толькі дэкларацыйным.

Больш за тое, у тым жа 1986г. пачалася шырокая хваля барацьбы з непрацоўнымі даходамі, у лік якіх траплялі таксама і даходы ад розных промыслаў. (Збор законаў Беларускай ССР, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Мн., 1986. Арт. 290). Безумоўна, што гэта не стымулявала развіццё творчай актыўнасці насельніцтва, што з’яўляецца адной з важнейшых задач сацыяльнай палітыкі. Між тым “Закон аб гасразліку і дагаворных цэнах” замест чаканага павышэння вытворчасці выклікаў пагоню за звышпрыбыткам і знікненне танных тавараў народнага спажывання. Безумоўна, гэта негатыўна адбілася на эканамічным становішчы грамадзян. Выйсці з такога крызісу толькі кадравымі перастаноўкамі было ўжо немагчыма.

Пасля шматлікіх дыскусій аб шляхах выхаду з крызісу (што тады называлася палітычна нейтральным тэрмінам – “перабудова”) пытанне было вырашана на карысць рынку. Пры гэтым пераход да рынкавай эканомікі павінен быў адбывацца паступова. Да таго ж рынкавая эканоміка разглядалася не канчатковай мэтай рэформ, а толькі як сродак выхаду з цяжкага эканамічнага становішча краіны. Пры дапамозе рынку прапаноўвалася пабудаваць сацыяльна арыентаваную эканоміку, ліквідаваць тэхнічнае адставанне ад развітых краін Захаду. Была зроблена спроба забяспечыць рэальныя ўмовы для развіцця творчай актыўнасці ў грамадзян. Здавалася, што гэты пераход будзе магчыма здзейсніць у параўнальна кароткі тэрмін і без значных страт. Такі настрой грамадства пацвярджаецца сацыялагічным апытаннем 1990г. (Человек и рынок. (социологический мониторинг). Мн., 1992. С. 5).

Такія кардынальныя змены ў сферы вытворчасці аказалі ўплыў і на іншыя бакі жыцця грамадства. Напрыклад, у сацыяльнай абароне-

насці насельніцтва, яго працаўладкаванні, на яго правы і інш. Нягледзячы на шматлікія заявы з боку ўрада аб тым, што зніжэння жыццёвага ўзроўню не будзе дапушчана, пазбегнуць гэтага не ўдалося. Яно адбывалася аб'ектыўна, непазбежна, бо было выклікана структурнымі зменамі ў сферы вытворчасці. У краіне з'явіліся першыя афіцыйныя беспрацоўныя.

Каб згладзіць працэс расслаення грамадства і дапамагчы малазабяспечаным групам (інвалідам, пенсіянерам, перасяленцам з зоны, пацярпелым ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС), выдзяляліся ўсё большыя сродкі. Частка сродкаў выдзялялася і на перападрыхтоўку беспрацоўных. Акрамя гэтага, у 1990 г. Вярхоўны Савет БССР першым з парламентаў СССР прыняў пастанову аб індэксацыі даходаў (Збор законаў Беларускай ССР, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Мн., 1990. Арт. 63). Але Беларусь ужо пасля атрымання незалежнасці не прызнала сапраўднасць аблігацый таварнай пазыкі 1990 г., што моцна падарвала давер да дзяржавы. А далейшая лібералізацыя цэн у студзені 1993 г. і інфляцыя прывялі да яшчэ большага расслаення грамадства.

Тым не менш былі і станоўчыя вынікі. Адмена артыкула пра кіруючую ролю партыі на Першым з`ездзе дэпутатаў Вярхоўнага Савета СССР у 1989 г. дала штуршок да лібералізацыі ўсіх бакоў жыцця, развіццю дэмакратычных свабод і прававой абароненасці грамадзян. Такое прынцыповае палітычнае рашэнне і прыняцце “Закона аб дзяржаўнай мове…” (Збор законаў Беларускай ССР, указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. Мн., 1990. Арт. 46) спрыялі развіццю нацыянальнай культуры, адукацыі, інфармацыі, якія з гэтага часу сталі неабмежаванымі. Людзі атрымалі таксама значна большую магчымасць выязджаць за мяжу, але пры гэтым не была адменена прапіска. Разам з тым, па ацэнках Міжнароднага інстытута прэсы ў Вене на 1993г., Беларусь адносілася да самай нізкай катэгорыі сацыялістычных дзяржаў па ступені свабоды сродкаў масавай інфармацыі. (Карбалевич В. И. Внутренняя политика Беларуси. В кн.: Государственная политика Республики Беларусь в 1993 году. Основные параметры. Мн., 1994. С. 29).

З правядзеннем першых сапраўды дэмакратычных выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР, БССР і мясцовыя Саветы людзі атрымалі большы доступ да кіраўніцтва дзяржавай, што спрыяла складванню дэмакратычных форм кіраўніцтва на агульнаграмадскім узроўні. А спроба правядзення прыватызацыі, якая пачалася з кастрычніка 1992 г., павінна была ліквідаваць адчужэнне людзей ад маёмасці.

Але аналіз вынікаў сацыяльнай палітыкі Беларусі ў перыяд з 1985 па 1994г. паказвае відавочную палавінчатасць і супярэчлівасць рэформ, якія праводзіліся ў рэспубліцы. Уся віна за правал гэтых рэформ ляжыць на наменклатурным кіраўніцтве краіны, якое не толькі не выкарыстала магчымасці для больш хуткага і паспяховага пераадолення аб'ектыўных цяжкасцей пераходнага перыяду, але і дапусціла рэзкае збядненне большасці грамадства. Гэтаму спрыялі і неэфектыўныя намаганні ў справе рэфармавання сельскай гаспадаркі і канверсія ваенна-прамысловага комплексу. Невыпадкова 77% апытаных лічаць, што ў пагаршэнні матэрыяльнага становішча насельніцтва ў першую чаргу павінна дзяржава. (Шавель С. А. Тенденции изменения социальной структуры Беларуси. Мн., 1996. С. 47). Сярод станоўчых вынікаў сацыяльнай палітыкі гэтага дзесяцігоддзя можна назваць дэмакратызацыю ўсіх бакоў жыцця грамадства, пачатак складвання шматпартыйнай сістэмы, развіццё дэмакратычных свабод, без якіх было б немагчыма станаўленне незалежнай дзяржавы. Тым не менш перыяд з 1985 па 1994г. можна лічыць часам нявыкарыстаных магчымасцей.

УДК 377.5

М. Н. Демидко, аспирантка

## РЕАЛИЗАЦИЯ СОВРЕМЕННЫХ ТРЕБОВАНИЙ К УЧЕБНОМУ ПРОЦЕССУ ЧЕРЕЗ СОДЕРЖАНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ

In this article looking about modern demand educational process across the maintenance education.

Любое учебное заведение должно быть для человека развивающим пространством, создающим условия для его саморазвития и самоактуализации.

Известно, что учебный процесс - это процесс двусторонний, включающий деятельность преподавателя и учащихся. Преподаватель выступает в качестве специалиста в области преподаваемого предмета и профессионала, владеющего искусством обучения и формирования личности учащегося с заданными качествами.

Вторая сторона учебного процесса - деятельность учащихся, представляющая собой систематический труд по усвоению учебного материала и творческое применение этих знаний, умений и навыков в процессе учебной и будущей профессиональной деятельности. Руководящая роль в процессе обучения принадлежит преподавателю, а ус-